# Букет для Нябеснай Маці

Марыя Гербедзь

Ганна Шакола




2. У букет для Нябеснай Маці
Вазьму чысціню лілеі,
Вазьму я рамонак белы
І кветачкі васількоў.
Букет для Нябеснай Маці
Складу я з сваёй надзеі,
Складу я з адданай веры,
Дадам да ўсяго любоў.